Уладзіславу Мікалаевічу Васільеву,
ветэрану Вялікай Айчыннай вайны,
жыхару пасёлка Мар'іна
Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці
ад навучэнцаў і выкладчыкаў
Мар'інагорскага дзяржаўнага
аграрна-тэхнічнага каледжа

ВЫ ёсць! ВЫ з намі! ВЫ жывы!

Паважаны Уладзіслаў Мікалаевіч!

75-годдзе вызвалення нашай радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў – яшчэ адна магчымасць узгадаць гераічныя старонкі Вашай ваеннай біяграфіі і выказаць словы ўдзячнасці за тое, што мы жывём у мірны час у вольнай краіне.

Вы былі трошкі старэйшымі за нас, калі жыццё раздзялілася на "да" і "пасля": пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ваша выхаванне не дазволіла зрабіць іншы выбар, як узяць у рукі зброю і ўстаць на абарону Айчыны. На Вашу долю выпалі цяжкія ваенныя выпрабаванні: сражэнні і раненні, голад і холад, блакадны Ленінград і смерць таварышаў, маральныя перажыванні і фізічны боль. На шчасце, Вы ў поўнай меры адчулі радасць Перамогі, раздзялілі яе са знаёмымі і незнаёмымі абаронцамі Радзімы. А сёння мы, маладое пакаленне нашай краіны, адзначаем гэтае свята з Вамі і таксама раздзяляем радасць Перамогі.

Вы праявілі свае лепшыя якасці і паказалі гераічны ўзор змагання з ворагам. Вашы шматлікія ўзнагароды ўвасабляюць прыклад мужнасці і патрыятызму.

У складаны час пасляваеннага аднаўлення Вы працягвалі аддана служыць Радзіме, працавалі на яе росквіт. Працавалі самі і вучылі працаваць сваіх выхаванцаў. Вы аздобілі не толькі сваё, але і наша жыццё: сёння мы маем магчымасць не проста любавацца Вашымі работамі, а ў іх прыгажосці адчуваць дабрыню і чэрпаць натхненне на карысныя справы.

Мы не проста памятаем пра подзвіг Ваш і Вашых таварышаў. Мы ганарымся Вамі, бо ў Вашай біяграфіі мы бачым подзвігі нашых прадзедаў, якія адваявалі для нас права жыць пад мірным небам, на

сваёй зямлі, гаварыць на роднай мове, працягваць традыцыі і развіваць культуру.

Яскравым прыкладам сапраўднага кахання і вернасці стала для нас Ваша сям’я. На працягу 70 гадоў Вы застаецеся сапраўдным абаронцам сваіх жанчын: жонкі , нявесткі, унучак, праўнучкі і прапраўнучак! Усе гэтыя гады напоўнены каханнем, пяшчотай, дабрынёй, адказнасцю,

Мы ганарымся асабістым знаёмствам з Вамі, удзячны лёсу, што Вы ёсць у нашым жыцці.

Віншуючы са святам, мы абяцаем рабіць усё, каб Вы былі ўпэўненымі ў нашай шчырасці і дабрыні. Верым, што ў нашых словах Вы чуеце не толькі віншаванне і пажаданні здароўя, дабра і дабрыні, шчырых усмешак блізкіх, магчымасці раздзяляць іх поспехі яшчэ шмат гадоў, але і словы ўдзячнасці за Ваш бессмяротны подзвіг і вялікую Перамогу, за тое, што мы не ведаем пакут вайны, за тое, што сваім жыццём мы абавязаны Вам і Вашым ваенным таварышам.

Дзякуй, што ВЫ ёсць, што ВЫ з намі, што ВЫ жывы!